па справе «СВБ», зноў арыштаваны ў 1937—41 за ранейшыя «злачынствы», большасць з іх расстраляны ці загінулі ў канцлагерах. Некат. з «удзельнікаў «СВБ» былі арыштаваны ў 1949—52 трэці раз і асуджаны на вечнае пасяленне ў Сібіры на той падставе, што былі асуджаны раней. Сярод іх Дубоўка, М.М.Улашчык і інш. Усе рэабілітаваны ў 1956—88 за адсутнасцю саставу злачынства. Матэрыялы справы «СВБ» складаюць 29 тамоў. Галоўнымі сярод іх па аб'ёме і значнасці з'яўляюцца уласныя паказанні арыштаваных, якія ў асобных выпадках складаюць сотні старонак машынапісных копій. Матэрыялы справы «СВБ» — важная і каштоўная крыніца па гісторыі бел. нац.-вызв. руху ў пач. 20 ст., абвяшчэння і дзейнасці БНР, *Слуцкага паўстання 1920*, бел. масонства (гл. *Беларускае брацтва*) і інш.

*Літ.*: Міхнюк У. Захоўваць вечна: справа № 20951-с // Маладосць. 1992. № 6; Яго ж. Справа Вацлава Ластоўскага // Там жа. 1993. № 8—9; Яго ж. Вязень сумлення // Полымя. 1996. № 2; Яго ж. Арыштаваць у высылцы: Дак. нарыс пра Алеся Дудара. Мн., 1996; Платонаў Р.П. Лёсы: Гіст.-дак. нарысы аб людзях і малавядомых падзеях духоўнага жыцця ў Беларусі 20—30-х гг. Мн., 1998; Яго ж. На крутым павароце: Ідэолага-паліт. барацьба на Беларусі ў 1929—1931 гг. Мн., 1999. *Уладзімір Міхнюк.*

**САЮЗ ГАРАДО́Ў**, Усерасійскі саюз гарадоў, гл. ў арт. *Земска-гарадскі саюз.*

**САЮЗ ДАСЯГНЕ́ННЯ РАЎНАПРА́ЎЯ ЯЎРЭ́ЯЎ У РАСІ́І.** Існаваў з сак. 1905 да мая 1907. У Беларусі саюз дзейнічаў у Гомелі, Мінску, Гродне і інш. гарадах і мястэчках. Устаноўчы сход адбыўся ў крас. 1905 у Вільні, створаны цэнтр. камітэт саюза, у які ўвайшлі М.Вінавер (старшыня), Ю.Гесен (сакратар), С.М.*Дубноў*, Г.Б.Сліёзберг. Дзейнасць зводзілася да арганізац. мер для ўдзелу яўрэяў у выбарах у Дзярж. думу, прававой дапамогі яўр. насельніцтву. Чл. саюза выступалі за асіміляцыю яўрэяў у складзе Рас. імперыі (у адрозненне ад сіяністаў), за роўныя правы ў галіне адукацыі і культуры, за тэр. аўтаномію. Па нац. пытанні падтрымлівалі партыю кадэтаў. Адбыліся 4 з'езды саюза. У сак. 1906 саюз перайменаваны ў «Таварыства раўнапраўя яўрэйскага народа ў Расіі». Члены саюза ўдзельнічалі ў выбарах у 1-ю Дзярж. думу (6 дэпутатаў увайшлі ў фракцыю кадэтаў) і 2-ю Дзярж. думу. Саюз меў друк. выданні: газ. «Еврейская жизнь» (1905—07), «Хроника еврейской жизни» (1905—06), «Еврейский выборщик» (1907). У маі 1907 саюз раскалоўся на «Яўрэйскую народную групу», Яўрэйскую нар. партыю (заснавальнік Дубноў) і сіянісцкую партыю. *Эмануіл Іофе, Эдуард Ліпецкі.*

**САЮ́З ЛЕСАПРАМЫСЛО́ЎЦАЎ ПАЎНОЧНА-ЗАХО́ДНЯГА КРАЮ**, рэгіянальнае манапалістычнае аб'яднанне лесапрамыслоўцаў у Рас. імперыі ў пач. 20 ст. Створаны з мэтай процідзеяння Саюза ўсх.-прускіх лесагандляроў і лесапрамыслоўцаў навязаць рас. лесаэкспарцёрам свае ўмовы экспарту лесу ў Германію. Саюз прадстаўляў інтарэсы лесапрамыслоўцаў Арлоўскай, Валынскай, Віленскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і інш. губ., якія гандлявалі лесам і ляснымі матэрыяламі і транспартаваннем іх па Вісле і Нёмане ў Кёнігсберг, Данцыг, Мемель, Бромберг, Тыльзіт і Торн (Германія). У 1909 аб'ём экспартных паставак Саюза быў больш за 30 млн. руб. Для абароны сваіх інтарэсаў перад герм. лесаімпартнымі арг-цыямі саюз выступаў за ўсталяванне спец. гавані ў Юрбургу, заснаванне ін-та прысяжных мершчыкаў, нарміраванне экспарту для Паўн.-Зах. краю. Саюз вёў перагаворы пра аб'яднанне інш. рэгіянальнымі арг-цыямі (напр., Саюзам лесапрамыслоўцаў Віцебскай губ.) і стварэнне ўсерас. манапаліст. аб'яднання.

*Літ.*: Довнар-Запольский М.В. Народное хозяйство Белоруссии, 1861—1914 гг. Мн., 1926. *Вадзім Сяховіч.*

**САЮЗ ЛІТО́ЎСКАЙ МО́ЛАДЗІ**, гл. *Братні саюз літоўскай моладзі.*

**«САЮ́З МІХА́ІЛА АРХАНГЕЛА»**, «Рускі народны саюз імя Міхаіла архангела», масавая чарнасоценная (гл. *Чарнасоценцы*) арг-цыя ў Расіі ў 1908—17. Узнік у пач. 1908 у выніку выхаду з «*Саюза рускага народа*» шэрагу ультраправых дзеячаў на чале з У.М.Пурышкевічам (старшыня саюза да лют. 1914). Названы ў гонар нябеснага апекуна цара Міхаіла Фёдаравіча — заснавальніка дынастыі Раманавых. Кіруючы орган — Гал. палата, якая складалася з 14 членаў (у Пецярбургу) і выбіралася на з'ездах («сходах») тэрмінам на 3 гады. Аддзелы саюза былі ў Маскве, Кіеве, Адэсе, Мінску, Гомелі, Магілёве, Бабруйску, Оршы і інш. Праграма саюза ў значнай ступені супадала з праграмай «Саюза рус. народа», але прызнавала неабходнасць Дзярж. думы, скліканай паводле выбарнага закону ад 3.7.1907 (поўнае пазбаўленне выбарных правоў яўрэяў і абмежаванне прадстаўніцтва Польшчы і Каўказа), падтрымлівала аграрную палітыку П.А.*Сталыпіна.* Дзеячы «С.М.а.» актыўна выступалі ў друку (газ. «Колокол», штотыднёвікі «Прямой путь», «Зверобой»), распаўсюджвалі свае кнігі і брашуры, праводзілі сходы, гутаркі, масавыя акцыі, арганізоўвалі антысеміцкія кампаніі. Пасля Лют. рэвалюцыі 1917 дзейнасць «С.М.а.» (Гал. палаты і аддзелаў) спынена. Апошняя спроба адрадзіць падпольную арг-цыю зроблена Пурышкевічам восенню 1917, але пасля Кастр. рэвалюцыі 1917 змова была выкрыта і Пурышкевіч аддадзены пад суд (пазней памілаваны і вызвалены).

*Літ.*: Гл. ў арт. «*Саюз рускага народа*». *Анатоль Валахановіч.*

**САЮ́З МО́ЛАДЗІ БЕЛАРУ́СІ** (СМБ), Беларускі саюз моладзі (БСМ), добраахвотная маладзёжная арганізацыя. Створаны ў снеж. 1991 на XXX з'ездзе ЛКСМБ у выніку перайменавання яго ў СМБ. Асн. задачы — вырашэнне сац. праблем, абарона жыццёвых інтарэсаў маладых людзей. У лют. 1995 на XXXII з'ездзе СМБ перайменаваны ў БСМ, а ў маі 1999 на XXXIV з'ездзе — у грамадскае аб'яднанне Беларускі саюз моладзі. Аб'ядноўвае юнакоў і дзяўчат ва ўзросце 14—30 гадоў. На 1.1.1999 дзейнічалі ЦК, 6 абкомаў, 53 райкомы, 21 гарком, якія аб'ядноўвалі 21 950 членаў СМБ.

**САЮ́З ПАЛЯ́КАЎ НА БЕЛАРУ́СІ** (СПБ; Związek Polaków na Białorusi), добраахвотнае нац.-культ. аб'яднанне грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія лічаць сябе палякамі. Створаны ў 1986. Мэты саюза: адраджэнне і захаванне польскай мовы і культуры, ахова помнікаў гісторыі, архітэктуры і экалогіі, каардынацыя сумеснай дзейнасці дзярж. і грамадскіх арг-цый у вырашэнні праблем духоўнага развіцця польскага этнасу ў рэспубліцы. На 1999 у СПБ больш за 30 тыс. членаў. Паводле статута вышэйшым органам СПБ з'яўляецца з'езд, які склікаецца 1 раз у 4 гады. У перыяд паміж з'ездамі саюзам кіруе Гал. праўленне (знаходзіцца ў г. Гродна) на чале са старшынёй. Мае абл., гар., раённыя, мясц. пярвічныя арг-цыі. Найб. абл. арг-цыя пасля гродзенскай — *Саюз палякаў на Міншчыне.* СПБ удзельнічае ў правядзенні фестываляў, конкурсаў, аглядаў маст. самадзейнасці і інш. Хадайнічае перад Мін-вам адукацыі аб адкрыцці польскіх школ, збірае сродкі на іх фінансаванне. Падтрымлівае сувязі з Польшчай і польскай дыяспарай у свеце. Выдае газ. «*Глос з-над Немна*» і час. «Magazyn polski» («Польскі часопіс»). Пра нац.-культ. дзейнасць СПБ гл. таксама ў арт. *Палякі.* *Анатоль Валахановіч.*

**САЮ́З ПАЛЯ́КАЎ НА МІНШЧЫНЕ**, Саюз палякаў Мінскай вобласці, Мінская абласная арганізацыя *Саюза палякаў на Беларусі.*

**САЮ́З ПЛЯМЁН**, умоўная назва міжплемянных аб'яднанняў, якія ўтвараліся адначасова з пераходам ад роду да сельскай тэрытарыяльнай абшчыны і папярэднічалі ўтварэнню дзяржавы. У жал. веку ўзнікалі пад уплывам знешніх абставін (напр., для барацьбы са знешнімі ворагамі), пазней набывалі характар больш устойлівых аб'яднанняў для эпізадычных ваен. дзеянняў, праяўлення паліт. актыўнасці. Ва ўсх. славян у 8—9 ст. С.п. — значныя этнічныя групоўкі, у аснове якіх ляжалі родаплемянныя, тэрытарыяльныя, эканам. і паліт. сувязі. У «Аповесці мінулых гадоў» названы «княжаннямі», якія існавалі да ўзнікнення Кіеўскай Русі. Па сутнасці С.п. былі пранароднасцямі на розных узроўнях кансалідацыі. Адначасова яны былі пачатковымі дзярж. утварэннямі